

ІМІДЖ З НАДЗЕЯЙ НА БУДУЧЫНЮ 8

УПАЎ, АПРЫТОМНЕЎ — ГІПС... 9




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 ЖНІЎНЯ 2021 г. СЕРАДА № 147 (29516)


**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Іван КРУПКО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«На сёння збожжавыя ў краіне ўбраныя на 50,8 % плошчаў. Намалочана 3,5 млн тон збожжа пры ўраджайнасці 32 ц/га. Ва ўборцы ўдзельнічаюць 36 тысяч механізатараў. Падтрымліваем гатоўнасць тэхнікі на ўзроўні 97 %, самая высокая — у Брэсцкай, Мінскай і Гродзенскай абласцях: 99 %. Гэта дае магчымасць пры добрых умовах надвор'я ўбіраць у дзень 4-6 % плошчаў. Калі надвор'е дазволіць штодня выводзіць камбайны ў поле, то Брэсцкая вобласць за 5-6 дзён уборку можа практычна завяршыць. У цэлым па краіне можна скончыць уборачную кампанію за 12-13 нагодлівых дзён».*

# Залучаныя на жніве




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Кіроўца Вячаслаў КРАСУЦКІ наклейвае на свой самазвал знак «тысячніка».

**Брэнд Случчыны — гэта не толькі ўрадлівая зямля, але і дбайныя, руплівыя гаспадары на ёй. Хлебаробы «Аграфірмы «Лучнікі» плануюць атрымаць важкі каравай, і цяпер прыйшоў іх час — збіраць ураджай. Каля вёсак Лучнікі, Сярагі, Варкавічы, Падліпцы, Бязверхавічы — асноўныя палеткі прадпрыемства, там поўным ходам ідзе жніво. Некалькі дзён таму і мне давялося назіраць завяршальную — дажыначную стадыю спрадвечнага сялянскага клопату.**

СТАР. 13

КОРАТКА

- **На ўдзел у «Вялікай размове з Прэзідэнтам» паступіла ўжо больш за 300 заявак.**
- Сяргей Цяцерын падаў у адстаўку з пасады кіраўніка Беларускай тэніснай федэрацыі.
- **Беларусь запрасіла казахстанскі кантынгент для ўдзелу ў вучэннях «Захад-2021».**
- У Віцебскім раёне ў брацкай магіле перапахавалі астанкі больш як 80 салдат.
- **У Слуцкім раёне распачатыя дзве крымінальныя справы аб службовым падлогу пры справаздачнасці аб руху буйной рагатай жывёлы.**
- У Мінску пасля размоў з ілжэсупрацоўнікамі банка пенсіянерка пазбавілася больш за Br37 тысяч.
- **У Еўрасаюзе прызналі дзеючымі COVID-сертыфікаты Сан-Марына, дзе выкарыстоўваецца «Спадарожнік V».**
- Усіх жыхароў кітайскага Уханя праверацца на COVID-19 для прадухілення новай успышкі.

ISSN 1990 — 763X

Транспарт

## Рэгістрацыйныя карткі для таксістаў

**А яшчэ нармальны рабочы дзень, адпачынак і правы на «бальнічны»... Ці паўплываюць новаўвядзенні на тарыфы?**

**Намеснік міністра транспарту і камунікацый Беларусі Сяргей ДУБІНА падчас прэс-канферэнцыі падрабязна расказаў аб праекце новага ўказа Прэзідэнта «Аб пытаннях аўтамабільных перавозак пасажыраў».**



Як вядома, праект указа быў вынесены на грамадскае абмеркаванне ў апошняй дэкадзе ліпеня. «Мэта гэтага дакумента — забеспячэнне бяспекі перавозак пасажыраў, стварэнне ўмоў для добрасумленнай канкурэнцыі і павышэнне якасці паслуг, якія аказваюцца насельніцтву», — сказаў Сяргей Дубіна.

Паводле звестак Транспартнай інспекцыі, за мінулы год з удзелам перавозчыкаў таксі адбылося 76 дарожна-транспартных здарэнняў, пацярпелі 92 чалавекі. І, што найбольш сумна, загінулі 16 чалавек. Акрамя таго, цяпер асобныя нядобрасумленныя перавозчыкі з мэтай атрымання канкурэнтных пераваг выкарыстоўваюць незаконныя схемы па арганізацыі і выкананні перавозак.

СТАР. 4

Векапомнае

## МАКСІМАЛЬНА ПРАЎДЗІВА

**Ваенныя гісторыкі — аб дыскрэдытацыі подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, выяўленні новых фактаў і захаванні памяці**

**Тая вайна даўно стала мінулым, напоўненым як трагічнымі, так і гераічнымі падзеямі. Аднак дагэтуль не сціхаюць спекуляцыі на тэму ролі савецкага народа ў перамозе над фашызмам, а рэальныя факты набываюць новую інтэрпрэтацыю. Праблему супрацьдзеяння фальсіфікацыям гісторыі Другой сусветнай вайны, а таксама пытанне захавання гістарычнай памяці абмеркавалі падчас круглага стала «Каб памяталі. Апошняя ваенная аперацыя на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Выкрыццё заходніх рубяжоў краіны», які днямі адбыўся ў прэс-цэнтры Дома прэсы.**

### СУПРАЦЬСТАЯЦЬ ФАЛЬСІФІКАЦЫЯМ

Як адзначыў **рэктар Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў Нацыянальнай акадэміі навук Марат ЖЫЛІНСКІ**, гісторыкі, у тым ліку школьныя настаўнікі, павінны максімальна праўдзіва паказваць падзеі ваенных гадоў на тэрыторыі Беларусі. «Апошнім часам адбываюцца вельмі сур'ёзныя нападкі на нашу краіну, інсінуацыі, фальсіфікацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны, — канстатуе эксперт. — Да гэтага трэба адносіцца вельмі агрэсіўна. Мы ў апошнія гады сябе заспакоілі, палічылі, што мы такія памяркоўныя, у нас такая гісторыя, таму ніхто нас не кране. Яшчэ як крануць».

СТАР. 5